## ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ

На 2026 год у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь унесена 9 помнікаў архітэктуры, якія размяшчаюцца на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна.

Тры з іх – ансамбль былога палаца Храптовічаў у г.п.Бешанковічы, палац у г.п.Бешанковічы, комплекс былой сядзібы “Нізгалава” у аг.Двор Нізгалава – 2-ой катэгорыі, астатнія – 3-яй.

| Назва, датаванне, адрас (месца знаходжання), катэгорыя каштоўнасці, фотаздымак гісторыка-культурнай каўтоўнасці | Апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці |
|---|---|
| **1. Ансамбль былога палаца Храптовічаў (5 аб’ектаў), XVII – XX стст., г.п.Бешанковічы, катэгорыя “2”. Шыфр: 212Г000141**<br><br>**Каардынаты: 55,044931 29,463193** | Знаходзіцца ў цэнтры гарадскога пасёлка. У склад ансамбля ўваходзяць палац, 3 гаспадарчыя пабудовы (былая канюшня для выяздных каней, пральня і кухня) і фрагменты парку з вадаёмамі.<br>Першы 2-павярховы будынак пад палац (пазней гаспадарчая пабудова) быў пабудаваны ў сяр. XVII ст. Па легендзе, гэты будынак – першы палац (але, верагоднее, першапачатковы палац знаходзіўся на месцы сучаснага). Ён належаў Яну Самуэлю Агінскаму і менавіта з ім звязана імя Пятра I, які ў 1701 і 1705 гг. праязджаў праз Бешанковічы, а ў 1708 г. спыняўся тут падчас Паўночнай вайны.<br>У 1770-я гг. новы ўладальнік Бешанкковічаў Іахім Літавор Храптовіч пачаў будаўніцтва палаца ў стылі ранняга класіцызму (палац Храптовічаў).<br>Падчас Айчыннай вайны 1812 года ў палацы спыняўся імператар Францыі Напалеон I.<br>У 1821 г. некаторы час тут жыў рускі імператар Аляксандр I. 17 верасня 1821 г. ў Бешанковічах адбыўся парад рускіх войскаў, які прымаў сам імператар і ў якім бралі ўдзел будучыя дзекабрысты Трубяцкі, Мураўёў, Бястужаў-Румін і інш.<br>Зараз у будынку былой пральні знаходзіцца Бешанковіцкае аддзяленне дэпартмента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, у будынку былой канюшні – крама “Гаспадар”. |

| | |
|---|---|
|  **Гаспадарчая пабудова (былая кухня)**  **Гаспадарчая пабудова (былая пральня)**  **Гаспадарчая пабудова (былая канюшня для выязных коней)**  **Фрагменты парка**   **два вадаёмы** | Сапраўдным гонарам гаспадароў быў парк вакол палаца. Яго стварэнне адносяць да кан.XVII- пач. XVIII стст. |

**2. Палац, 1770-я гг., г.п.Бешанковічы, вул.Камуністычная, д.18, катэгорыя “2”.**
**Шыфр: 212Г000947**











Бешанковіцкая дзіцячая школа мастацтваў размяшчаецца ў будынку былога палаца Храптовічаў. Яго будаўніцтва пачалося ў 1770-я гг.

П-падобны ў плане. Цэнтральны 2-павярховы корпус выступае наперад, фланкіраван двума 1-павярховымі флігелямі. Над парадным уваходам ажурны балкон (чыгуннае ліццё 1-й пал. XIX ст.) у стылі ампір: іанічныя калонкі, гнутыя кранштэйны, маскароны, меандр, акантавы ліст. Першапачаткова ўнутраная планіроўка палаца была анфіладнай (цяпер зменена на калідорную).

У 2024 г. была завершана рэканструкцыя будынка.

**3. Свята-Ільінская царква, 1870 г., г.п.Бешанковічы, вул.Урыцкага,2, катэгорыя “3”. Шыфр: 213Г000143**



**Каардынаты: 55,047144 29,456133**





Праваслаўны храм, помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Менавіта са Свята-Ільінскай царквой звязана першае ўпамінанне пра Бешанковічы. Па легендзе, “у 1447 годзе Казімір IV у памяць выратавання сваёй жонкі ў 20-ы дзень ліпеня ад патаплення загадаў пабудаваць у Беларусі шэсць цэркваў у імя святога Іліі-прарока па берагах рэк Дзвіны, Дняпра і Сожа: у Віцебску, Бешанковічах, Магілёве, Крычаве, Оршы і Чэрыкаве”.

Свята-Ільінская царква знаходзіцца ў цэнтры гарадскога пасёлка. Пабудавана ў 1870 г. з чырвонай цэглы. Будынак квадратнай формы ў плане. У архітэктуры мураванага будынка адчуваецца імкненне да пампезнай мануменальнасці, буйнамаштабнасці. Збудаванне цэнтрычнай крыжова-купальнай пяцігалоўкавай кампазіцыі, ўзнятай на высокі цокаль. Два перпендыкулярна скрыжаваныя нефы завершаны магутным 8-гранным светлавым барабанам з шатром і макаўкай. Аналагічныя меншыя па маштабу завяршэнні маюць квадратныя ў сячэнні вуглавыя вежы-званіцы. Гэта надае сілуэту храма стракатасць, пірамідальнасць, раўнаважкасць агульнай масы і частак будынка. Унутраная прастора чатырма слупамі падзелена на тры нефы з крыжовымі скляпеннямі.

У 1960-х гг. настаяцелем царквы быў айцец Яўген Баслык, пасля яго – айцец Аляксей Міранович (з 1982 па 1991 гг.), з 1991 г. – па сёняшні дзень – настаяцель айцец Віталій Кісель.

21 ліпеня 1992 г. Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам зарэгістраваны “Прыход храма Святога пракора Іліі г.п. Бешанковічы Віцебскай епарії Беларускай Праваслаўнай Царквы”.

| | |
|---|---|
| **4. Парк “Саломінка”, пач. XX ст., в. Дабрыгоры, катэгорыя “3”. Шыфр: 213Г000149**<br> <br> <br>**Каардынаты: 54,98082 29,523722** | Помнік садова-паркавага мастацтва. Закладзены ў пач. XX ст. на плошчы 6,2 га, асноўныя пасадкі зроблены ў 1906 г. Стваральнікам лічыцца Пётр Міронавіч Красавіцкі (член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, ваенны ўрач) з дапамогай вядомага садавода-аматара Іосіфа Кандрацьевіча Мароза, ураджэнца в. Бачэйкава сучаснага Бешанковіцкага раёна. Тэрыторыя сада па перыметру была абсаджана экзотамі. Уздоўж прагулачнай плошчы высаджаны бук лясны, таполя Пятроўскага, ліпа буйналістaвая і інш. Ад параднай часткі хутара ішлі тры алеі. Алея, якая знаходзілась у западнай частцы парка, стварала прыгожы пейзажны дрэвовы масіў з піхты сібірскай, субальпійскай, белай і бальзамічнай, хвоі горнай і чорнай, арэха шэрага, лістоўніцы японскай і еўрапейскай. Адну алею ўтварала паласа рэдка пасаджаных бяроз. Усяго ў дэндрасаставе парка была высаджана каля 30 відаў дэкаратыўных раслін: сасна Веймутава і звычайная, клён звычайны, таксама татарскі, таполя звычайная і серабрыстая, дуб карлікавы і чырвоны, яблыня сібірская і еўрапейская, акацыя жоўтая і белая, бяроза барадаўчатая, елка белая Энгельмана, калючая, галубая, хвоі Банкса і інш. |
| **5. Мікалаеўская царква, пач. XIX ст., в. Дабрыгоры, катэгорыя “3”. Шыфр: 213Г000150**<br> | Царква – помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Знаходзіцца ў цэнтры вёскі Дабрыгоры. Пабудавана ў 1846 г. з дрэва. Крыжападобная ў плане. Да цэнтральнага кубічнага аб’ема прымыкаюць прамавугольныя ў плане апсіда і бабінец. Цэнтральны аб’ем з чатырохсхільным дахам, які завяршае “сляпы” васьмігранны барабан, накрыты шатром з макаўкай. Бабінец і апсіда накрыты двухсхільнымі дахамі з франтонамі на тарцах. Над бабінцам – двух ярусная званіца (васьмярык на чацверыку) з шатром і цыбулепадобнай галоўкай у завяршэнні. Будынак на высокім мураваным фундаменце, зрублены з брусоў, гарызантальна абшыты дошкамі. Сцены цэнтральнага аб’ему прарэзаны выцягнутымі паўцыркульнымі вокнамі з ліштванамі, бабінца і апсіды – |

| | |
|---|---|
| <br>**Каардынаты: 54,978496 29,521469** | вялікімі прамавугольнымі вокнамі з ліштвамі. Усе аб’емы апярэзаны падкарнізнымі цягамі аднолькавай шырыні. Перад цэнтральным уваходам – вялікі ганак.<br>У савецкі час царква была закрытая, а ў доме прычта пачала дзейнічаць пачатковая школа, якая ў 1951 г. набыла статус няпоўнай сярэдняй школы (сямігодка). Будынак царквы выкарыстоўваўся мясцовым калгасам пад розныя гаспадарчыя патрэбы.<br>У 1998-1999 гг. праведзены аднаўленчыя работы. |
| **6. Свята-Троіцкая царква (былы касцёл, пабудаваны ў гонар перамогі ў бітве на Уле ў 1564 годзе) XVI ст., XVIII ст., 1863-1864 гады, аг. Астроўна, вул.Мікалаевіча, 17Б, катэгорыя “3”. Шыфр: 213Г000875**<br> <br>**Каардынаты: 55,130647 29,864848** | Храм Святой Жываначальнай Тройцы ў аг.Астроўна самы старадаўні помнік архітэктуры Бешанковіцкага раёна, пабудаваны ў 1622 г. як рымска-каталіцкі касцёл на грошы старасты прапойскага, чачэрскага, крычаўскага, чашніка вялікага літоўскага Аляксандра-Дажбога Сапегі. Заснаванне Дамініканскага кляштара ў маёнтку Астроўна і ўзвядзенне пры ім велічнага мураванага касцёла было прымеркавана да пераможнага вяртання арміі ВКЛ пасля Хоцінскай бітвы (2 верасня – 9 кастрычніка 1621 г.). Пасля смерці вялікага гетмана літоўскага Яна Хадкевіча менавіта Аляксандр-Дажбог (Багдан) Сапега прывёў многапакутнае беларуска-літоўскае войска на радзіму. У сваім тастаменце ад 15 студзеня 1635 г. ён піша: “…Загадваю…цела маё…як па званню майму рыцарскаму трэба, зямлі было аддадзена ў касцёле Астровенскім Святога Дамініка, у маёнтку маім дзедзічным, мною ўфундаваным”.<br>У сучасным стане касцел уяўляе сабой выцягнуты па восі “усход – захад” цагляны будынак. У помніку архітэктуры сустракаюцца розныя тыпы мураванак: у ніжняе часцы – гатычная, у пілястрах – простая рэнесансавая, тычковая – у заходняй сцяне. |

**7. Комплекс былой сядзібы “Нізгалава”, другая палова XIX ст., аг. Двор Нізгалава, катэгорыя “2”. Шыфр: 212Г000152**



**Сядзібны дом**



**Кухня**



**Флігель**



**Вяндлярня**



**Рэшткі падмурка гаспадарчай пабудовы**

У комплекс уваходзяць: сядзібны дом, кухня, вяндлярня, флігель, рэшткі падмурка гаспадарчай пабудовы. Панская сядзіба пабудавана на паўднёвай ускраіне в. Двор Нізгалава каля р. Ула ў стылі позняга класіцызму. Цэнтрам кампазіцыі з’яўляўся доўгі прамавугольны ў плане 1-павярховы мураваны будынак з вальмавым дахам. Галоўны фасад дома вылучаецца неглыбокім рызалітам з руставанымі вуглавымі лапаткамі, рэгулярным рытмам прамавугольных аконных праёмаў, дэкарыраваных прафіляванымі сандрыкамі на плоскіх кранштэйнах і надваконнымі шышамі. У цэнтры дома размяшчалася парадная зала, якая выходзіла на плоскасны тыльны фасад трыма аконнымі прёмамі і была звязана з комнатамі доўгім калідорам. У пластыцы фасадаў выкарыставаны элементы класіцызма з характэрнай для 2-й пал. XIX ст. вольнай трактоўкай ордэра.

Да 1863 г. маёнтак належыў двараніну Шауману, пасля удзелу якога ў паўстанні 1863-64 гг. яго канфіскавалі ў дзяржаўную казну.

У кан. XIX ст. сядзібу набыла дваранка А.Няведская, а ў 1905 г. – адышла яе сыну адвакату К.І. Мядзведскаму. Сядзібны дом пашкоджаны ў 1944 г. у выніку баявых дзеянняў. Пасля аднаўлення ў 1970 г. у будынку размяшчалась Дзмітраўская васьмігадовая школа (дзйнічала да 2010 г.). З 2010 г. па 2013 г. – сельская бібліятэка.

Зараз будынак не выкарыстоўваецца.

| Каардынаты: 55,057045 29,152359 | |
|---|---|
| **8. Рэшткі Мікалаеўскай царквы, кан. XIX – пач.XX стст., в.Слабодка, катэгорыя “3”.**<br>**Шыфр: 213Г000162**<br><br> <br>**Каардынаты: 55,057128 29,275537** | Пабудавана з цэглы ў 1896 г. Крыжова-купальны храм. У аб’емна-прасторавай кампазіцыі дамінуе шмат’ярусная шатровая званіца з галоўкай. Над сяродкрыжжам гранены барабан з шатром, завершаны цыбулепадобная галоўкай. Фасады дэкарыраваны рустам, згрупаванымі і адзіночнымі паўкалонамі, шматпрафіляванымі карнізамі і паяскамі, какошнікамі, кілеадобнымі ліштвамі арачных аконных праемаў. Інтэр’ер вырашаны ў спрошчаных архітэктурных формах. Царква – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю (напрамак архітэктуры Расійскай імперыі 2-ой пал. XIX – пач. XX ст.) |

**9. Парк, 1769 г., аг. Бачэйкава, катэгорыя “3”.**
**Шыфр: 213Г000146**









**Каардынаты: 55,018088 29,154025**

Парк знаходзіцца за 500 м. на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р.Ула.

Закладзены пасля 1769 г. Парк рэгулярнага тыпу. Размешчаны на прыпойменным верхнім плато і пакатым схіле, апрацаваным трыма паралельнымі тэрасамі, якія спускаюцца да ракі (перапад 2 метры).

Цэнтрам сіметрычна-восевай кампазіцыі парку быў мураваны аднапавярховы палац (закладзены ў 1769 г., не захаваўся). Перад ім размяшчаўся авальны партэр, да якога вялі дзве ўзаемна перпендыкулярныя алеі. Адна з іх па восі ўсход-захад (па фронту будынка) вядзе да службовага флігеля і падзяляе тэрыторыю парку на дзве зоны. Перад палацам масіў ліп і таполяў, пасаджаных па рамбічнай планіровачнай сетцы. Частка парку за палацам афармлена газонамі, шпалерамі, баскетамі, фантанамі, лабірынтам. Складаная камбінацыя дарожак утварала манаграму ініцыялаў уладальніка маёнтка і геральдычныя фігуры фамільнага герба. Тут раслі ліпы, бэз персідскі, гартэнзія мяцёлчатая, кедры,паўночнаамерканскія елкі.

Некалькі штучных вадаёмаў, размешчаных у вуглавых частках парку, маюць правільную форму (квадрат, прамавугольнік, авал). З заходняга боку да парку прымыкаў сад, акружаны па перметры алеямі.

Галоўная восевая паркавая перспектыва адкрывалася з верхняй тэрасы і была пабудавана на змене шэрагу паркавых курцін, газонаў і бакавых шпалер, падстрыжаных пад шары, піраміды і аркі. Дэкаратыўна афармленыя пасадкі пераходзілі ў вялікую паляну, якая была абмежавана ракой і каналам, што злучаўся з ракой. Завяршалася перспектыва ландшафтам процілеглага берагавога схілу.

Парк пашкоджаны ў Вялікую Айчынную вайну.